**ВОДЗЫЎ**
**на аўтарэферат дысертацыі**
**Шаўчэнка Яны Сяргееўны**
**“Народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў (канец XIX – пачатак XXI ст.)”,**
**прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія**

Аб актуальнасці тэмы даследавання дысертанта сведчыць захаванне ў беларускім грамадстве традыцый шырокага выкарыстання дзікарослых раслін у лекавых і харчовых мэтах. Народныя веды пра дзікарослыя расліны маюць высокую каштоўнасць для фармацэўтычнай і касметычнай індустрыі, а з улікам захаванасці вялікай долі айчынных прыродных ландшафтаў, аналіз падобнай інфармацыі можа таксама прыўнесці свой уклад у забеспячэнне харчовай бяспекі краіны. У цэлым вывучэнне народных ведаў пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў спрыяе фарміраванню рацыянальных падыходаў да выкарыстання прыродных рэсурсаў Беларусі.

Навуковая навізна даследавання заключаецца ў комплексным міждысцыплінарным падыходзе да вывучэння народных ведаў пра дзікарослыя расліны і іх значэння ў матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Дысертантам уведзены ў навуковы зварот новы масіў палявых матэрыялаў. Вызначаны лакальныя асаблівасці і асноўныя трансфармацыі народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны на працягу канца XIX – пачатку XXI ст. Прааналізавана значэнне ведаў пра дзікарослыя расліны ў сучасных этнакультурных працэсах.

Практычная значнасць даследавання заключаецца ў магчымасці выкарыстанні яго вынікаў у лекцыйных курсах і праграмах для студэнтаў ВНУ па этналогіі і культуралогіі, у краязнаўчай працы, дзейнасці прыродна-экалагічных музеяў, у арганізацыі экалагічных фестываляў.

Структура дысертацыі вынікае з логікі пастаўленых задач і не выклікае пярэчанняў. Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння і бібліяграфічнага спісу.

У першай главе работы даецца аналіз гістарыяграфіі праблемы, характарызуюцца крыніцы даследавання, абгрунтоўваецца выбар метадаў даследавання.

У другой главе, якая мае назву “Дзікарослыя расліны ў матэрыяльнай культуры беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст.”, вызначаюцца сферы выкарыстання дзікаросаў у штодзённым матэрыяльным побыце беларусаў (кулінарыя, медыцына, дойлідства, цяслярства, выраб прадметаў хатняга ўжытку), даецца пералік найбольш запатрабаваных з увагай на рэгіянальную спецыфіку відаў раслін.

У трэцяй главе ("Дзікарослыя расліны ў духоўнай культуры беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст.") вызначаецца роля народных ведаў пра дзікарослыя расліны ў каляндарна-абрадавым цыкле, раскрываецца семантыка іх выкарыстання. Даецца апісанне абрадаў з выкарыстаннем дзікарослых раслін у сямейнай абраднасці. Аўтар прыводзіць класіфікацыю сукупнасці дзікарослых раслін, якія ўжываліся ў пахавальнай абраднасці.

У чацвёртай главе ("Веды пра дзікарослыя расліны ў этнакультурных працэсах Рэспублікі Беларусь") дысертант абгрунтоўвае важнасць выкарыстання ведаў пра дзікарослыя травы ў мэтах умацавання экалагічнай і этнічнай самасвядомасці беларусаў, а таксама прыводзіць прыклады актуалізацыі дадзенай інфармацыі ў сучасным культурным і грамадска-палітычным жыцці краіны.

Асаблівую каштоўнасць працы ўяўляе сістэмнае выкарыстанне аўтарам міждысцыплінарных крыніц (з галін гісторыі, фалькларыстыкі, этнабатанікі, этнаэкалогіі, лінгвістыкі),

Матэрыялы даследавання прадстаўлены ў 21 публікацыі аўтара (7 з іх – рэцээнзаваныя навуковыя артыкулы, уключаныя ў Спіс навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў; 13 – публікацыі ў зборніках навуковых артыкулаў; 9 – матэрыялы навуковых канферэнцый; 1 – кніжнае навукова-папулярнае выданне па тэме даследавання).

Прадстаўлены аўтарэферат дазваляе зрабіць выснову, што дысертацыя Я. С. Шаўчэнка "Народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў (канец XIX – пачатак XXI ст.)" з'яўляецца самастойным кваліфікацыйным даследаваннем, якое выканана адпаведна ўсім патрабаванням. Я. С. Шаўчэнка заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія.

Загадчык кафедры сацыяльных камунікацый УА "Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай", кандыдат гістарычных навук, дацэнт — С.А. Шыдлоўскі

Подпись Шидловского С.С. удостоверяю
Специалист по кадрам

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай» Аддзел кадраў